настаўніцкі інстытут, а ў 1912 г. – аграпамічны факультэт Маскоўскага сельскагаспадачага інстытута.

У час польска-савецкай вайны 1919-1920 гг. Ярашэвіч М.К. узначальваў Мінскую губернскую земскую управу, працаваў выкладчыкам Мінскага політэхнічнага вучылішча. 18 верасня 1919 г. у час прыезду ў Мінск Ю. Пільсудскага і яго сустрэчы з грамадскасцю М.К. Ярашэвіч быў адзіны, хто выступіў з публічным пратэстам супраць польскай акупацыі краю.

З аднаўленнем савецкай улады ён стаў рэктарам Беларускага дзяржаўнага палітэхнікума, адначасова дэканам ляснога факультэта, загадваў аддзелам па прафесійна-тэхнічнай адукацыі Наркамата асветы рэспублікі, выкладаў у Мінскім інстытуце народнай адукацыі (МІНА) і быў ініцыятарам стварэння і старшынёй Беларускага вольна-эканамічнага таварыства.

9 сакавіка 1921 г. Ярашэвіча М.К. арыштавалі па абвінавачанні ў антысавецкай дзейнасці. Дзякуючы заступніцтву 38 выкладчыкаў МІНА і Беларускага Дзяржаўнага Палітэхнікума праз 2 месяцы ён быў вызвалены. Але не на доўга: 18 лістапада 1922 г. быў зноў асуджаны на 2 гады высылкі ў Тайшэт. Вызвалены 28 сакавіка 1924 г. У1924 – 1937 гадах Ярашэвіч М.К. працаваў у Сярэднеазіяцкім універсітэце, Інстытуце ірыгацыі і механізацыі сельскай гаспадаркі Узбекскай ССР. Але ў 1937 годзе ён быў зноў арыштаваны "за шпіянаж на карысць замежных разведак і асуджаны без права перапіскі на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў Краснаярскага краю, дзе і загінуў. Так скончылася жыццё выдатнага беларускага і узбекскага грамадска-палітычнага дзеяча, вучонага, навукоўца-агранома, педагога, першага рэктара Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

УДК 009 (476)

## Асаблівасці культурнага жыцця ў БССР ва ўмовах палітычнай "адлігі" (сярэдзіна 1950-х – першая палова 1960-х гг.)

Багдановіч А.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Сярэдзіна 1950-х гг. з'явілася новым этапам у развіцці беларускай культуры, пачатак якога азнаменаваў XX з'езд КПСС (люты 1956 г.)

Духоўнае развіццё тых часоў адлюстроўвала складаны і супярэчлівы працэс барацьбы двух тэндэнцый: дэмакратычнай, якая імкнулася да вызвалення ўсіх сфер жыцця ад скажэнняў сталінскай эпохі, і

кансерватыўнай, якая імкнулася зберагчы і прыстасаваць старыя рычагі да новых рэалій грамадскай свядомасці.

Цэнтрам навуковай працы ў рэспубліцы з'яўлялася Акадэмія навук БССР. Тут праводзіліся работы па стварэнню новых сплаваў, тэхналогіі апрацоўкі металаў. Паспяхова распрацоўваліся пытанні калоіднай хіміі, рацыянальнага выкарыстання торфу, развіцця жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах рэспублікі.

Прыкладна з 1953 г. новыя тэндэнцыі намеціліся ў развіцці беларускай літаратуры. Пачаўся працэс пераадолення апісальнасці, паглыблення ва ўнутраны свет герояў, у сутнасць канфліктаў пасляваеннай эпохі.

У пачатку 1960-х гг. пачынаецца аднаўленне беларускага мастацтва. У ім нараджаюцца новыя тэндэнцыі, звязаныя з прыходам маладых творчых сіл, якія ў многім вызначылі характар яго далейшага развіцця.

Такім чынам, перыяд хрушчоўскай "адлігі" характарызаваўся якаснымі зменамі ў развіцці культуры Беларусі (як і ўсяго СССР). Ішоў працэс аднаўлення беларускай літаратуры, навукі, адукацыі і мастацтва. БССР перажывала своеасаблівы культурны ўздым. Аднак у гэты час мелі месца і сур'ёзныя супярэчнасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі, што не магло не адбіцца на яе культурным развіцці. І асабліва трывожнай тэндэнцыяй, што назіралася ў 1950-я – 1960-я гг., быў усплеск русіфікацыі нацыянальных культур, звужэнне сферы выкарыстання беларускай мовы.

УДК 008 (476+44)(091)

## Белорусско-французские культурные связи

Баландин К.И.
Белорусский национальный технический университет

История культуры Беларуси тесно связана с культурами других народов и стран, особенно пограничных. Многие деятели культуры Беларуси внесли свой вклад в развитие культуры Франции. Так, в XIX веке здесь жили, учились, творили такие известные уроженцы Беларуси, как поэт Адам Мицкевич, ученый Игнат Домейко, художники Валентин Ванькович и Наполеон Орда и многие другие.

В XX веке, в разные годы (в основном в послеоктябрьский период) во Франции работали художники Марк Шагал и Хаим Сутин, Надежда Ходасевич (Леже), Борис Заборов, поэт Оскар Милош и другие. Многие известные белорусы–французы похоронены на территории Франции. Так, на кладбище Сент-Женевьев-де-Буа в Париже нашли свой последний приют бывший гродненский губернатор В.Н. Шебеко, юрист Н.В. Тесленко, философ Н.О. Лосский.